Сямейная газета

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

7 ВЕРАСНЯ 2017 г. ЧАЦВЕР №172 (28536)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## З горада ў вёску



## Мірскі замак — сваімі рукамі



## Зімой не замерзнем

СТАР. 2

# ЧАС ВУЧЫЦЦА



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Раман МАТУЛЬСКІ, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі:**

*«Віртуальнымі карыстальнікамі нашай Нацыянальнай бібліятэкі сёння з'яўляюцца жыхары 111 краін. Практычна кожны пяты віртуальны карыстальнік — іншаземец. Гэта жыхары Расіі, Украіны, Казахстана, ЗША, Германіі, Польшчы, Літвы, Латвіі, Малдовы, Узбекістана, Вялікабрытаніі і іншых краін. Іх колькасць з моманту пераезду бібліятэкі ў новы будынак у 2006 годзе павялічылася ў 18 разоў і на 1 жніўня 2017-га складае больш за 86 тысяч. Агульная ж колькасць карыстальнікаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі складае 163 тысячы, штогод ім выдаецца каля 2,5 млн экземпляраў дакументаў».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 07.09.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9242 | ▼ |
| Еўра | 2,2960 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0335 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0740 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

17172>

9 771990 763008

■ Выпрабавана на сабе

## НЕ РАСКОША, А СРОДАК ПЕРАМЯШЧЭННЯ

### Уласны аўтамабіль больш не патрэбны?

**З 24 жніўня ў Мінску запрацаваў першы ў нашай краіне сэрвіс па каршэрынгу (кароткатэрміновай арэндзе аўтамабіляў) Drivetime. Скарыстацца ім можна, калі ў вас ёсць смартфон, актыўная банкаўская карта і, вядома, вадзіцельскае пасведчанне. Наш карэспандэнт пратэсціраваў навінку і высветліў, ці зможа такі сэрвіс навязаць барацьбу таксі, а таксама ці ёсць сэнс адмаўляцца ад уласнага аўто.**

СТАР. 13



Фота Надзеі БУЖАН.

■ Беражыце сябе!

## Пачытайце састаў ёгурту, які вы купляеце...

### Людзі любяць салодкае і салёнае, і вытворцы ахвотна ідуць ім у гэтым насустрач. Як паўплываць на сітуацыю?

**Ужо даўно медыкі б'юць трывогу: сучасныя людзі залішне ўжываюць солі, цукру, тлушчаў. І частка віны за гэта ляжыць у тым ліку і на сучаснай харчовай прамысловасці, якая думае не пра наша з вамі здароўе, а пра тое, каб прадукцыя «разляталася» з паліц. Таму ў каўбасу і хлеб ва ўсім свеце кладуць у некалькі разоў больш солі, чым патрабуецца, а ў ёгурт і кетчуп сыплюць цукру больш, чым сярэдні чалавек дадае ў гарбату. Да чаго гэта прыводзіць, а таксама пра спробы паўплываць на харчовых гігантаў, мы гутарым са старшынёй Беларускай асацыяцыі ўрачоў, намеснікам кіраўніка Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Дзмітрыем ШАЎЦОВЫМ.**

Мы ўсе ведаем пра шкоду гарэлкі, віна і цыгарэт. Але вось што датычыцца, напрыклад, солі... Людзі яе выкарыстоўваюць спакон веку. І мы не думаем пра тое, што яна можа выклікаць незваротныя змены ў арганізме, якія павольна назапашваюцца і ўрэшце могуць прывесці да катастрофы. Тое ж самае датычыцца і цукру, і маргарыну...

— Сёлета я быў у Маскве на круглым стале Сусветнай арганізацыі аховы здароўя (СААЗ), дзе ўзнімалася пытанне прафілактыкі неінфекцыйных захворванняў, якія з'яўляюцца бічом нашага часу. Вельмі шмат дакладаў спецыялістаў было прысвечана харчаванню, — расказвае Дзмітрый Шаўцоў. — Цяпер СААЗ лічыць, што ёсць усе перадумовы на першае месца сярод усіх фактараў рызыкі паставіць соль, а ўжо потым — алкаголь і тытунь.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ ЛЯДОЎНЮ АБО ВЯНДЛЯРНЮ

Ідзе падпіска на «Звязду» на IV квартал 2017 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!